## ✲ ПРАДМОВА

# Полацку трэба прадавацца

Сяргей Шыдлоўскі, аўтар эсэ «Зьбіраньне Полацку» ў гэтым нумары ARCHE, кажа, што гістарычна-духоўная спадчына Полацку бачыцца яму зручным месцам для дасягненьня нацыянальнага ідэалягічнага кампрамісу ў Беларусі. Я, на жаль, не падзяляю гэтага сьветлага аптымізму, не ў апошнюю чаргу таму, што ніяк не магу ўзгадаць, калі ж гэта было такое, каб у Беларусі дасягнулі — безь пісталета — хоць якога-колечы ідэалягічнага кампрамісу ў нацыянальным маштабе. Затое я без засьцярогаў пагаджаюся з аўтарам, калі ён цьвердзіць, што гістарычны аспэкт сёньняшняга Полацку можа паслужыць добрым фундамэнтам для збудаваньня турыстычнага бізнэсу.

Рэч тут ня толькі ў тым, што газ няўмольна даражэе або што грошай патрабуюць усе, а з ідэалёгіі няма ніякага наедку. Хутчэй за ўсё рэч у тым, што *pecunia non olet* — калі можна зарабіць на полацкай гісторыі, то хто будзе глядзець на тое, што гэтая гісторыя ня надта ўкладваецца ў рамкі нейкай ідэалёгіі, хай сабе й дзяржаўнай. Інакш кажучы, тое, што напісалі У. Арлоў і Г. Сагановіч пра полацкі пэрыяд дзесяцівяковай беларускай мінуўшчыны, можа яшчэ доўга чакаць афіцыйнага *imprimatur*, каб увайсьці ў школьную праграму, але пры спрыяльнай каньюнктуры — то бок пры яшчэ большай эканамічнай бязвыхаднасьці краіны — яно можа зусім хутка і беспраблемна апынуцца ў турыстычных буклетах і даведніках. Рэкляма — рухавік бізнэсу.

Лёс турыстычнага Полацку, праўда, залежыць ад лёсу турыстычнага Менску. Замежнікі прыедуць у Полацак пакінуць там свае грошы толькі тады, калі ім будзе рупіць прыехаць у Менск. Ну, але правінцыі нельга іначай: яна заўсёды залежыць ад сталіцы. Пакуль што Менск пасьпяхова праводзіць сваю прамоцыю як манумэнтальнага і — у эўрапейскім маштабе — унікальнага музэю рэальнага сацыялізму. Значыць, ёсьць шанец, што міжнародная цікавасьць да яго не аслабне, а зь цягам часу будзе нават узрастаць. Што да турыстычнай прамоцыі Полацку, дык яе б належала пачаць неадкладна. У Полацку няма, як у Менску, выразнага гандлёвага брэнду. Магчыма, у Полацку няма і больш элемэнтарных рэчаў — перш за ўсё рэстаранаў, гатэляў і турыстычных бюро, то бок турыстычнай інфраструктуры.

Я ніколі ў Полацку ня быў, а таму даволі моцна зьдзівіўся, калі Алесь Аркуш запрапанаваў мне напісаць нешта накшталт уводзінаў у «полацкі

нумар» ARCHE. (Ну, але яму там відней. Мабыць, яму быў патрэбны погляд патэнцыйнага турыста, нават калі і не зусім 100-працэнтна замежнага.) Я марна спрабаваў знайсьці ў Інтэрнэце адрасы нейкіх гатэляў і рэстаранаў у Полацку, дзе я мог бы затрымацца й паесьці, калі б прыехаў туды пагаманіць з Аркушам, Шыдлоўскім ці Мудровым пра беларускую літаратуру й правінцыю. Я ведаю, што хлопцы знайшлі б мне начлег і далі б паесьці. Але рэч у тым, што гэта не вырашае агульнай праблемы — дзе затрымацца ў Полацку магчымаму натоўпу замежнікаў, які можа туды прыперціся, забаблены ўсімі тымі крывава-сур'ёзнымі гісторыямі Арлова—Сагановіча.

Сорамна прызнацца, але ў Інтэрнэце мне таксама не ўдалося знайсьці, колькі прыблізна людзей жыве ў сёньняшнім Полацку. Затое, калі я запускаў Google на пошук «Полац(а)к насельніцтва», я даставаў адрасы старонак, зь якіх мог падрабязна даведацца, як лік полацкага насельніцтва зьмяняўся пад узьдзеяньнем усіх тых сечаў і напасьцяў у X—XVIII стагодзьдзях. Дзеля параўнаньня, я ўпісаў у Google «Gniezno» — так палякі называюць свой «Полацак», адкуль пайшла іхная дзяржаўнасьць — і адразу ж дазнаўся як пра колькасьць сёньняшніх жыхароў гэтага гораду, гэтак і пра яго гатэлі ды рэстараны, што паказвае ня столькі на розьніцу ў эканамічным разьвіцьці гэтых двух гарадоў, колькі на розьніцу ў разьвіцьці нацыянальных мэнталітэтаў. Адзін народ усё яшчэ намагаецца палавіць лятучыя фантомы свае мінуўшчыны, а другі даўно ўжо намёртва папрышпільваў свае ў школьных падручніках і жыве з дывідэндаў ад сваіх нябожчыкаў.

У далейшай пэрспэктыве, усё ж, Полацку павінна пашанцаваць з рэальным жыцьцём. Ён павінен добра прадавацца. Я мяркую з чэскай правінцыі, куды заглядаю пару разоў на год. Хоць Празе і перападае несумненная бальшыня дывідэндаў ад чэскіх нацыянальных магільнікаў, але і правінцыя не крыўдуе. Дастаткова паехаць у любую пару году ў Кутну Гору, Чэскі Крумлаў або Карлштайн, каб пераканацца, што й там можна няблага жыць з продажу свае гістарычнае апрычонасьці. Прычым чэскія правінцыйныя гарадкі ня могуць пахваліцца й трацінай такіх жахаў і дзівосаў, якія можна закінуць у даведнік пра Полацак.

*сакавік 2004, Прага*

*Ян Максімюк*